**ЗБОР ТВО́РАЎ**, від літаратурна-мастацкага выдання, у якім сабраны творы аднаго аўтара. Існуюць З.т. поўныя і няпоўныя. Поўныя З.т. уключаюць у сябе маст. творы, артыкулы, лісты, прамовы, пераклады і інш. тэксты, напісаныя не толькі на нац., але і на інш. мовах. Яны патрабуюць дасканалага вывучэння жыцця і творчасці пісьменніка, з'яўляюцца плёнам шматгадовай працы цэлага навук. калектыву. Няпоўныя З.т. могуць выдавацца з пэўнай нагоды (напр., да юбілею пісьменніка) і ўключаюць толькі частку творчага набытку аўтара. Адным з першых (няпоўных) З.т. у гісторыі бел. л-ры стала 6-томнае выданне твораў Я.Купалы, здзейсненае ў 1925—32 Дзярж. выд-вам БССР. Пісьменнік сам рыхтаваў творы да выдання, уважліва праглядаў кожны тэкст, выпраўляў памылкі ранейшых выданняў. У тым жа выд-ве ў 1928—29 з'явіўся першы З.т. Я.Коласа ў 2 тамах. У 1952—54 быў выдадзены З.т. Я.Коласа ў 7 тамах. У 1960-я гг. супрацоўнікамі аддзела выдання і тэксталогіі Ін-та л-ры імя Я.Купалы АН Беларусі былі падрыхтаваны З.т. Я.Купалы ў 6 тамах (1961—63), Я.Коласа ў 12 тамах (1961—64). Поўны З.т. Я.Купалы ў 9 тамах выдадзены ў 1995—2003. У 1992—95 здзейснена выданне поўнага З.т. М.Багданові-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ча ў 3 тамах. У 1927—28 і ў 1968 былі выдадзены няпоўныя З.т. паэта ў 2 тамах, а таксама аднатомнік «Творы» (1957). У 1970—80-я гг. падрыхтаваны З.т.: Я.Купалы (т. 1—7, 1972—76), Я.Коласа (т. 1—14, 1972—78), К.Чорнага (т. 1—8, 1972—75), І.Мележа (т. 1—10, 1979—85), М.Лынькова (т. 1—8, 1981—85), М.Гарэцкага (т. 1—4, 1984—86), П.Пестрака (т. 1—5, 1984—86), З.Бядулі (т. 1—5, 1985—89), П.Броўкі (т. 1—9, 1987—92). У 1987—91 выйшаў у свет З.т. У.Караткевіча ў 8 тамах (8-ы том складаецца з 2 кніг). З 2007 пачалі выдавацца першыя кнігі 20-томнага З.т. Я.Коласа, падрыхтаванага супрацоўнікамі аддзела выдання і тэксталогіі Ін-та мовы і л-ры імя Я.Коласа і Я.Купалы НАН Беларусі (цяпер Цэнтр даследаванняў бел. культуры, мовы і л-ры), і распачалася праца над З.т. І.Шамякіна ў 23 тамах (у 2010—12 выйшлі т. 1—8). 2) Вучэбны дапаможнік з задачамі і практыкаваннямі. *В.І.Еўмянькоў.*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова